**Назва музея:** “Музей Працоўнай славы г.Оршы”

**Назва ўстановы адукацыі:** “Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гімназія № 1 г.Оршы імя Г.В.Сямёнава”.

**Адрас музея:** Віцебская вобласць, г. Орша, вул. Задняпроўская, д.1, пак. 40.

**Профіль:** гістарычны (агульнагістарычны)

**Сайт музея**: няма

**Старонка музея на сайце ўстановы адукацыі**: https://gimn1.goroo-orsha.by/%D0%BE-%D0%B3%D0%B8%D0%BC%D0%BD%D0%B0%D0%B7%D0%B8%D0%B8/%D0%BC%D1%83%D0%B7%D0%B5%D0%B8/%D0%BC%D1%83%D0%B7%D0%B5%D0%B9-%D1%82%D1%80%D1%83%D0%B4%D0%BE%D0%B2%D0%BE%D0%B9-%D1%81%D0%BB%D0%B0%D0%B2%D1%8B

**Старонка ў сацыяльных сетках:** няма

**Інфармацыя аб музеі:** музей адкрыты 3 сакавіка 1986 года. Кіраўнік музея – Кузьменка Аляксей Аляксандравіч. Музей складаецца з 7 раздзелаў і распавядае пра працоўную дзейнасць аршанцаў у розны час: ад нараджэння нашага горада да сённяшніх дзён.

На базе музея праводзяцца аглядная і тэматычныя экскурсіі, для наведвальнікаў музея распрацаваны квэст-рум “У доктара Музееферкуса”, падчас якога ўдзельнікі квэст-рума даведваюцца пра асобныя аб’екты асноўнай экспазіцыі музея шляхам вырашэння лагічных задач і ўмення працаваць у камандзе. Савет музея актыўна ўдзельнічае ў акцыі “Вахта памяці”, праводзіць лекцыя і інфармацыйныя гадзіны сярод вучняў гімназіі, на якіх ідзе расповед пра працоўную дзейнасць аршанцаў. На базе музея праходзяць урокі мужнасці, сустрэчы з ветэранамі Сацыялістычнай Працы, прыём у піянеры. На базе музея працуе гурток “Юныя экскурсаводы”. У музеі праводзяцца наступныя тэматычныя экскурсіі: “Гарады-пабрацімы”, “Ганаровыя грамадзяне Оршы”, “Прамысловыя прадпрыемствы горада”, “Орша ў гады Вялікай Айчыннай вайны;”, “Гісторыя Оршы да 1917 года”.

**Кароткая характарыстыка музейных фондаў**: асноўны фонд налічвае 163 музейныя прадметы і ўключае ў сябе экспанаты, звязаныя з гісторыяй працы і побыту людзей да 1917 года. Тут можна ўбачыць выраб аршанскіх ганчароў, кавалёў, цесляроў і столяраў. Таксама ёсць форма адзення мужчынская і жаночая, ручнікі і хатнія прылады працы. У раздзеле “Орша ў гады Вялікай Айчыннай вайны” сабраны асабістыя рэчы вайскоўцаў, газеты, дакументы. У раздзеле “Прамысловыя прадпрыемствы горада” прадстаўлена вялікая колькасць прадукцый прадпрыемстваў нашага горада. Дапаможны фонд – 439, які уключае ў сябе копіі дакументаў, газеты, граматы, лісты падзякі і інш.

**Найбольш каштоўныя музейныя прадметы:** кніжка працоўная на імя Пашкевіч З.П. – 1939г./1986г. , машынка швейная “Легмаш” – 1960 г./1986 г., патэфон – 1930–ыя гады/1985г. , крэсла драўлянае – пачатак ХХ ст / 1986 г., бязмен – пач. ХХ ст./1986 г., білет дэпутацкі на імя Баркоўскага Б.А.

– 1975/1986 г,, пропуск дырэктару Аршанскага ільнокамбіната Сямёнаву Георгію Васільевічу–1970/1988;

**Апісанне экспазіцый:**

1. “Гісторыя Оршы і праца жыхароў да 1917 года”. У экспазіцыі ідзе аповед пра гісторыю развіцця горада з моманту яго ўтварэння да 1917 года. Экспанаты ўзнаўляюць побыт таго часу. Яны прадстаўлены ганчарнымі вырабамі, вырабамі з тканіны, дрэва, металу. Ёсць фатаграфіі, дзякуючы якім можна ўявіць Оршу ў мінулым, газеты 1915 года, здымак аршанскай фатаграфіі «Арыэль».

2. “Працоўныя дасягненні і жыццё гараджан з 1917 года па 1941 год”. У экспазіцыі прадмтаўлены фотаздымкі перадавікоў вытворчасці, працоўныя кніжкі – нямыя сведкі працоўных подзвігаў аршанцаў.

3. “Орша ў гады Вялікай Айчыннай вайны”. У экспазіцыі маюцца: фотаздымкі, дакументы, газеты, якія распавядаюць пра асобныя эпізоды барацьбы аршанцаў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тут прадстаўлена і падзяка ад 2 мая 1945 года, выдадзеная Кавалёву А.Л. за ліквідацыю групы нямецкіх войскаў на паўднёвы ўсход ад Берліна.

4. “Ганаровыя грамадзяне г.Оршы”. У экспазіцыі раздзела прадстаўлены газеты, дакументы і фатаздымкі пасляваенных гадоў да 1970-х гадоў, ёсць пасведчанне дэпутата ганаровага грамадзяніна горада Оршы Баркоўскага Я. А.

5. “Георгій Васільевіч Сямёнаў”. У экспазіцыі ідзе расповед аб біяграфіі Сямёнава Георгія Васільевіча, дырэктара Аршанскага лькамбіната з 1940 года па 1968 год. У вітрынах размешчаны пропуск і граматы дырэктара Аршанскага ільнокамбіната.

6. “Прамысловыя прадпрыемствы горада”. У экспазіцыі на стэндах прадстаўлена інфармацыя аб прадпрыемствах Оршы. Ёсць узоры гатовай прадукцыі некаторых прадпрыемстваў: першая бытавая швейная машына, выпушчаная на заводзе “Легмаш”; калекцыя ўзораў тканін, якія вырабляюцца на Аршанскім ільнокамбінаце; калекцыя футра і воўны, якія выкарыстоўваюцца на швейнай фабрыцы “Світанак”. Прадстаўлены ўзоры прадукцыі інструментальнага завода.

7. “Гарады-пабрацімы”. У экспазіцыі раздзела самы вялікі матэрыял сабраны аб горадзе-пабрацiме Воз-ан-Улене.

**Узнагароды музея:**

Мерапрыемства “Фестываль музеяў” Асацыяцыі школ Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, 2023. Дыплом 1 ступені (кіраўнік музея-А.А.Кузьменка)

**Фотаздымкі музея:**

https://drive.google.com/drive/folders/1AI0H3dqbdUH-4syL6xD64x-Xp7fdcPy0?usp=sharing

**Дадатковыя матэрыялы:** відэаролікі (афіша музея ці экскурсія па музею альбомнай арыентацыі, ў добрай якасці і змесце), брашура, каталог.

https://www.youtube.com/watch?app=desktop&v=nuqaGFQb1V4
https://www.youtube.com/watch?v=5hkj6d1AwfY